ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
5
ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 25 (1475)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

бюро парткома зацверджаны арганізацыйны камітэт па стварэнню пярвічнай арганізацыі Усесаюзнага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць.

І. КЕЗІК.

### НОВЫМІ ВЫДАННЯМІ

папоўніліся выстаўкі, аформленыя аддзелам рэдкіх і каштоўных кніг бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна. Студэнты з цікавасцю пазнаёмяцца з выстаўкамі «Прыжыццёвыя выданні У. І. Леніна», «Гісторыя кнігі», якая ўключае творы К. Маркса, Ф. Энгельса, што выйшлі ў дарэвалюцыйны час у Расіі, выданні першых гадоў Савецкай улады, а таксама з раздзелам «Беларусь у дарэвалюцыйных выданнях». Увагу аматараў кнігі прыцягне падборка мініяцюрных і малафарматных выданняў. Тут сабраны творы К. Маркса, Ф. Энгельса, класікаў рускай і савецкай літаратуры, беларускіх празаікаў і паэтаў — усяго каля 600 экземпляраў.

Нядаўна аддзелам аформлена новая выстаўка «Залатое слова рускай літаратуры», прысвечаная 800-годдзю «Слова аб палку Ігаравым». Тут можна пазнаёміцца з лепшымі выданнямі гэтага твора.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

### РАДАСНАЯ ПАДЗЕЯ

адбылася ў жыцці калектыву народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш». У час летніх канікулаў яны наведалі Народную Рэспубліку Балгарыя, дзе прынялі ўдзел у Міжнародным фестывалі фальклору. Гледачы шчыра віталі выступленне універсітэцкіх самадзейных артыстаў. Калектыву аднадушна было аддадзена першае месца і ўручаны Вялікі Залаты медаль фестывалю.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

### ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ

— гэта час адпачынку, калі можна набрацца сілы, энергіі, бадзёрасці. Для студэнтаў-замежнікаў яшчэ і магчымасць пабываць ў сябе на радзіме. Многія праводзяць свой летні адпачынак у Савецкім Саюзе. А для таго, каб ён быў цікавым і разнастайным, распрацавана культурная праграма. Сярод іншых мерапрыемстваў — экскурсіі па гарадах СССР. Сёлета замежныя студэнты пазнаёміліся са славутасцямі Ленінграда, Баку, Кіева, Валгаграда, Ташкента, Ерэвана. Да іх паслуг — дом адпачынку «Нарач», лагер працы і адпачынку «Любань», а таксама санаторый-прафілакторый «Нарач».

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# НОВЫ РУБЕЖ

У АПОШНІХ дакументах і пастановах ЦК КПСС глыбока распрацаваны актуальныя праблемы далейшага паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышэння дабрабыту савецкіх людзей. Якія задачы ў сувязі з гэтым стаяць перад партыйнай арганізацыяй універсітэта? Неабходна мабілізаваць усе магчымасці і рэзервы, каб выйсці на новыя рубяжы якасці вучэбна-выхаваўчай работы і навуковых даследаванняў. За гэтай сціслай формулай павінна стаяць штодзённая напружаная праца камуністаў, усіх выкладчыкаў і студэнтаў.

Аснову вучэбнага працэсу павінна складаць неабходнасць глыбокага ўсведамлення вялікіх пераўтварэнняў, вызначаных партыяй. Тут патрэбна не простая дэкларацыя вядомых палажэнняў аб паскарэнні развіцця нашага грамадства, аб павышэнні арганізаванасці, дысцыпліны, гаспадарлівасці. Неабходна, каб кожная вучэбная дысцыпліна — гуманітарная ці прыродазнаўчая — данасіла да студэнтаў сутнасць сацыяльных пераўтварэнняў, якія ў першую чаргу залежаць ад канкрэтнага ўкладу кожнага савецкага чалавека.

Партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія і іншыя грамадскія арганізацыі павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на паляпшэнні арганізацыі вучэбнага працэсу, засяродзіць намаганні на ліквідацыі недахопаў. Але гэта толькі частка работы. Галоўнае — неабходна стварыць такія ўмовы, каб кожны студэнт і выкладчык змаглі праявіць свой талент у напружанай працы. У сувязі з гэтым партыйныя бюро разам з дэканатамі павінны добра ведаць каэфіцыент карыснага дзеяння кожнага выкладчыка, яго ўплыў на вучэбны і выхаваўчы працэс і, зыходзячы з гэтага, вызначаць яго месца ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў.

Зразумела, што вучэбна-выхаваўчы працэс павінен абапірацца на высокую свядомасць усіх членаў нашага калектыву.

На нарадзе ў ЦК КПСС па пытаннях паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў гаварыў: «Партыйная работа мае справу з рашаючым фактарам усіх перамен — чалавекам. ...Увесь вопыт партыі гаворыць: мала што можна змяніць у эканоміцы, кіраванні, выхаванні, калі не ажыццявіць псіхалагічную перабудову, не выпрацаваць жадання і ўмення думаць і працаваць па-новаму». Гэта азначае, што ўсе камуністы, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта павінны быць бліжэй да студэнтаў, выхоўваць іх не толькі ведамі, але і жыццёвым вопытам, ідэйнай перакананасцю, нацэленасцю на мэтанакіраваную і напружаную працу на карысць Радзіме. На лекцыі можна выдатна выкласці законы прыроды, але каб пазнаць формулы жыцця і чалавечых адносін, нашы педагогі павінны абудзіць у сваіх вучнях сілы душы.

У фарміраванні агульнага настрою на мэтанакіраваную і эфектыўную працу важнае значэнне мае шырокая прапаганда савецкага ладу жыцця, выкаранення шкодных звычак. Гэтыя патрабаванні сфармуляваны ў пастанове ЦК КПСС аб пазбаўленні грамадства ад п'янства і алкагалізму. Пачэсны абавязак камуністаў, усіх выкладчыкаў данесці да кожнага студэнта сутнасць масавага антыалкагольнага руху, згубнасць гэтай з'явы для грамадства і для чалавека. З мэтай прапаганды агульнай цвярозасці ва універсітэце вядзецца падрыхтоўка да стварэння пярвічнай арганізацыі Усесаюзнага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць. Партыйныя бюро павінны ўважліва падысці да вылучэння кандыдатур у аргкамітэт па стварэнню таварыства, разгарнуць вывучэнне пастановы партыі, а галоўнае — наладзіць дзейсны кантроль за яе выкананнем. Усю нашу працу патрэбна скіраваць на той рэзультат, каб кожны член калектыву лічыў сябе асабіста адказным за выкананне пастановы партыі, сваімі паводзінамі паказваў прыклад іншым.

Разам з тым, неабходна ўсямерна паляпшаць быт і адпачынак студэнтаў і выкладчыкаў, на што нацэльвае Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню выкарыстання клубных устаноў і спартыўных збудаванняў». Камуністам гаспадарчай часткі, прафсаюзным камітэтам, выкладчыкам кафедры фізвыхавання і спорту неабходна больш рацыянальна выкарыстоўваць спартыўную базу, наладзіць адпачынак студэнтаў. У гэтай справе патрэбна адысці ад беспадстаўных спасылак на розныя цяжкасці, а аб'яднаць сілы студэнцкага самакіравання, грамадскіх арганізацый для правядзення інтэлектуальнага адпачынку, выхавання неабходнасці пастаянна займацца фізкультурай і спортам. Гэту справу патрэбна паставіць пад кантроль партыйных бюро.

У новым навучальным годзе партыйныя арганізацыі факультэтаў і падраздзяленняў павінны павялічыць свой уплыў на развіццё навуковых даследаванняў. На кафедрах і ў лабараторыях, у навукова-даследчых інстытутах неабходна яшчэ больш уважліва вывучыць назапашаны патэнцыял, стварыць умовы для распрацоўкі перспектыўных і неабходных для народнай гаспадаркі тэм, а затым і хуткага іх укаранення ў вытворчасць. Партыйная арганізацыя навукова-даследчай часткі павінна вывучыць магчымасці галіновых лабараторый, вызначыць карыснасць іх працы, усямерна дапамагаць тым лабараторыям і кафедрам, дзе калектывы працуюць плённа, з вялікай эфектыўнасцю. Партгрупы кафедраў павінны спрыяць развіццю студэнцкай навукі, каб да заканчэння універсітэта дасканала ведаць, хто мае права і неабходныя здольнасці для вучобы ў аспірантуры. Гэта мае вялікае значэнне ў справе падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў выкладчыкаў.

Калектыў нашага універсітэта настойліва працуе, каб дастойна сустрэць XXVII з'езд КПСС. Каб наша праца ўлілася значным здабыткам у дасягненні ўсяго савецкага народа, патрэбна павысіць арганізаванасць і дысцыплінаванасць кожнага камуніста, накіраваць усе намаганні на далейшае развіццё сацыялістычнага грамадства.

А. СЛУКА,
намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце, дацэнт.

# Мы — першакурснікі!

ФОТАРЭПАРТАЖ З ПЕРШАВЕРАСНЁЎСКАГА СВЯТА ЧЫТАЙЦЕ НА 2—3 СТАРОНКАХ НУМАРА.



ЭКСКУРСІЯ ПА УНІВЕРСІТЭТУ

# СМЯЛЕЙ У ДАРОГУ

**Ты, паважаны першакурснік, лічышся паўнапраўным членам нашага калектыву. Прайшлі першыя дні заняткаў. Ужо добра вывучана дарога на свой факультэт. Але вось бяда: апыніся ў якім іншым месцы універсітэта і ты наўрад ці знойдзеш шлях назад. Мы цябе добра разумеем. Тэрыторыя, якую займае універсітэт, даволі вялікая. Навічку зусім лёгка заблудзіцца ў лабірынце універсітэцкіх лесвіц. А што, калі мы з табой зробім маленькае падарожжа? Па універсітэту. Згодзен? Тады ў дарогу.**

НАШЫМ АДПРАЎНЫМ пунктам стане факультэт, на якім ты вучышся. Калі ты студэнт філфака, то гэта будзе вуліца Чырвонаармейская, калі журфака — адправімся з вуліцы Свярдлова, возьмем з сабой студэнтаў біялагічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі, якія знаходзяцца далей за ўсіх ад галоўнага корпуса універсітэта — на вуліцы Курчатава. Па дарозе на вуліцы Маскоўскай забяром студэнтаў-юрыстаў і аддзялення замежнай журналістыкі. А калі прыбудзем на плошчу Леніна да галоўнага корпуса, то тут ужо будуць чакаць студэнты факультэта прыкладной матэматыкі, механіка-матэматычнага, гістарычнага і фізічнага факультэтаў, словам, тыя, хто вучыцца ў галоўным і фізічным карпусах. Падыдуць да нас і будучыя географы і хімікі, факультэты якіх знаходзяцца побач, на Ленінскім праспекце і вуліцы Ленінградскай адпаведна.

Такім чынам, усе ў зборы. Пара пачынаць. У нашага падарожжа адправіліся як фізікі, так і лірыкі. Як адны, так і другія сцвярджаюць, што нічога агульнага паміж імі няма. І ўсё ж дазвольце запярэчыць. Па-першае, хіба няма на факультэце ў кожнага з вас дэканата? На большасці факультэтаў тут жа ля дэканата знаходзім расклад заняткаў. Вось нехта з першакурснікаў глянуў і заківаў галавой: «Нічога не разумею». І сапраўды, расклад адрозніваецца ад школьнага. Тут на кожны прадмет адводзіцца па дзве гадзіны, што часцей называюць «парай». Паміж гадзінамі «пары» ёсць перапынак у пяць мінут. А пасля «пары» гэты перапынак большы.

Давайце заглянем у адну са студэнцкіх аўдыторый. Празвінеў званок на лекцыю — усе студэнты ў зборы. Хочам папярэдзіць: адметная рыса ўсіх выкладчыкаў — яны вельмі не любяць тых, хто спазняецца на заняткі. У аўдыторыю зайшоў выкладчык. Студэнты падняліся — так яны вітаюць яго. На сталах ужо ляжаць сшыткі-канспекты. Занатоўванне — вялікае майстэрства. Гэта ты хутка зразумееш. Выбраць галоўнае, не губляць агульнай думкі, пісаць акуратна, каб потым можна было зразумець самому — вось толькі некаторыя патрабаванні да канспекта. З дапамогай яго ты будзеш рыхтавацца да семінарскіх і практычных заняткаў, але асаблівую значнасць яго ты ацэніш у час сесіі (ты, напэўна, ведаеш, што яна праходзіць два разы ў год), калі ў надзвычай кароткі час патрэбна будзе здаць экзамены за цэлы курс. У такім выпадку добры канспект—самы лепшы дапаможнік.

І зноў хочацца звярнуцца да знаёмай спрэчкі паміж фізікамі і лірыкамі. У камітэце камсамола аднаго з прыродазнаўчых факультэтаў здзіўлена разводзілі рукамі: «Не ведаем, чым яны больш любяць займацца: матэматыкай ці мастацкай самадзейнасцю? Калі меркаваць па адзнаках, атрыманых на ўступных экзаменах, то матэматыкай. А калі палічыць, колькі разоў за гэтыя дні яны заходзілі ў камітэт камсамола, то гэта ж і артысты, і спартсмены, і камсамольскія работнікі». Хочацца толькі падараваць за такіх студэнтаў. Бясспрэчна, сябры, для студэнта вучоба была, ёсць і будзе галоўнай справай. Але той не студэнт, хто не зведаў рамантыкі будатрадаўскіх будняў, хто не папрацаваў увосень на «бульбе», хто не ўдзельнічаў у спартыўных спаборніцтвах. Не замыкайся ў сабе. Заходзь у камітэт камсамола. Тут ты заўсёды чаканы чалавек. Прапаноўвай, дапамагай. І ты ўбачыш: тваё жыццё стане больш змястоўным.

А зараз давай пакінем твой факультэт і пройдзем у галоўны корпус. На другім паверсе знаходзяцца рэктарат, партком, на трэцім — камітэт камсамола. Ты таксама, напэўна, заўважыў на другім і трэцім паверхах шыльдачкі з надпісам: «Бібліятэка». Разам са сваёй групай прыйдзеш сюды за падручнікамі. Тут табе выдадуць білет чытача, па якому будзеш мець права ўзяць кнігі на абанеменце, а таксама займацца ў чытальнай зале. І будзе вялікая просьба да цябе. Не бяры за прывычку набраць шмат кніг. Своечасова здавай іх назад.

Падымаемся вышэй. На чацвёртым паверсе знаходзім кафедру фізічнага выхавання. Мы ўжо ведаем, што ты любіш займацца спортам. Калі ласка, запісвайся ў спартыўныя секцыі. Іх тут багата: секцыі баскетбола, лёгкай атлетыкі, вольнай барацьбы, валейбола...

А вось і ФГП — факультэт грамадскіх прафесій. За час вучобы ва універсітэце ты зможаш набыць яшчэ адну прафесію. Для гэтага табе неабходна выбраць аддзяленне ФГП, на якім будзеш займацца. Гэта можа быць школа маладога лектара, гурток бальных танцаў, аддзяленні дыктараў і вядучых, мастакоў-афарміцеляў і іншыя. Запомні: прахадны бал на гэты факультэт — улюбёнасць у выбраную прафесію.

Ты ўжо прытаміўся крыху, праўда? Вельмі нядрэнна было б паабедаць. У такім выпадку давай спусцімся ўніз. У цокальным паверсе галоўнага корпуса ёсць сталовая. А калі ты жадаеш, мы зможам прайсці ў сталовую хімічнага корпуса. Смачна паесці можна ў сталовых факультэтаў журналістыкі і радыёфізікі і электронікі. А таксама можна звярнуцца да паслуг буфетаў, якія знаходзяцца на фізічным факультэце і ў памяшканні бухгалтэрыі.

Побач з бухгалтэрыяй на вуліцы Бабруйскай — універсітэцкая паліклініка. Сюды ты заўсёды зможаш звярнуцца за медыцынскай дапамогай.

А дзе ты будзеш жыць? У інтэрнаце? Значыць, цябе можна шукаць на вуліцы Свярдлова ў інтэрнаце № 1, на вуліцы Кастрычніцкай у інтэрнатах №№ 2, 6, 5 і 7, па праспекту Машэрава, дзе размешчаны інтэрнат № 4, або на вуліцы Курчатава ў інтэрнаце № 3. А калі ты апынуўся па-за спісам студэнтаў, якія будуць жыць у інтэрнаце? Не трэба засмучацца. Па меры магчымасці цябе абавязкова заселяць туды. А пакуль што зайдзі ў прафком універсітэта (трэці паверх галоўнага корпуса). Там ты зможаш узяць адрас, дзе здаецца кватэра.

Прайшлі першыя дні тваёй вучобы ва універсітэце. Адбыліся першыя знаёмствы з аднакурснікамі. І яшчэ больш прываблівым стала гэта загадкавае слова «бульба». Што табе ўзяць з сабой у калгас, куды пакласці рэчы? Высветлі гэта ў старшакурснікаў. Яны ахвотна падзеляцца з табой. А з нашага боку парада: бяры з сабой добрую песню, ласкавую ўсмешку, працоўны настрой, бо там табе давядзецца не толькі добра папрацаваць, а і з канцэртам выступіць перад мясцовымі жыхарамі, і лекцыю школьнікам прачытаць.

Шмат дзе пабывалі мы з табой сёння. Будзем вельмі рады, калі наша падарожжа было карысным для цябе. І ўсё ж ці не здаецца табе, што мы нешта прапусцілі. Так, гэта наша рэдакцыя, рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт», якая знаходзіцца ў памяшканні геаграфічнага корпуса, пакой № 3. Падпісацца на газету ты зможаш у час падпісной кампаніі, якая пройдзе на ўсіх факультэтах у кастрычніку. Заходзь, калі ласка, да нас, дасылай свае допісы. Рэдакцыя заўсёды будзе рада атрымаць іх.

А. МАТУСЕВІЧ,
наш кар.

# ГАРЫ,

ФОТАРЭПАРТАЖ







*І ДЗЕНЬ той быў на дзіва сонечны, і настрой надзвычай святочны. Ды хіба магло быць інакш у дзень усенароднага Свята Ведаў! Асабліва ўрачыстым і прыгожым выглядаў у той дзень універсітэт — флагман беларускай навукі. Гэта было яго свята: свята яго студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў. Радасна было яшчэ і ад таго, што ў гэты дзень ён прымаў новае папаўненне — юнакоў і дзяўчат, якія сталі студэнтамі ўсіх яго факультэтаў.*





*17 гадзін. Каля ўваходу ва універсітэт — ганаровы прэзідыум. У яго складзе — загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Ю. П. Смірноў, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мышкоў, начальнік упраўлення МінВНУ БССР У. Т. Воднеў, сакратар Мінскага АК ЛКСМБ А. П. Начоўкіна, кіраўніцтва універсітэта.*

*— Тавары рэктар БДУ імя У. І. Леніна, студэнты першага курса для правядзення ўрачыстай цырымоніі свята Дня ведаў-85 пастроены,— дакладвае сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Казулін.*

# АГОНЬ ВЕДАЎ!

З ПЕРШАВЕРАСНЕЎСКАГА СВЯТА





*Пад гукі маршу байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў уносяць на імправізаваную сцэну Ганаровыя сцягі, заваяваныя студэнтамі універсітэта ў вучобе і працы.*

*Усіх прысутных вітае рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.*

*Ганаровае права несці агонь ведаў даецца лепшым студэнтам універсітэта. Палае агонь ведаў. І разгарацца яму ярчэй і ярчэй, бо прымае яго сёння новае пакаленне знаходлівых, цікаўных, дапытлівых.*

*З пачаткам новага навучальнага года студэнтаў віншуюць міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, сакратар парткома універсітэта М. І. Дзямчук, дэкан механіка-матэматычнага факультэта, прафесар М. І. Юрчук, загадчык кафедры беларускай літаратуры, прафесар А. А. Лойка, загадчык кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, прафесар С. С. Шушкевіч, студэнт пятага курса гістарычнага факультэта, грамадзянін Эфіопіі, дэлегат XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве Абай Габрэ. І думка іх выступленняў адна — вучыцца можна толькі працуючы. Толькі паўсядзённая і настойлівая праца прынясе радасць і поспех, дазволіць атрымаць веды.*

*А зараз самы хвалюючы момант свята — пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. З гэтага моманту іх жыццё пачынаецца з чырвонага радка. Сімвалічны ключ у Краіну ведаў, які ўручае рэктар універсітэта, дазволіць ім расчыніць любыя дзверы ў таямніцы навукі, а агонь ведаў, перададзены старшакурснікамі, будзе заўсёды асвятляць гэты цярністы шлях. І так, першакурснік, у добры час!*

**А. АНАТОЛЬЕВА.**







● ● ●

***НА ЗДЫМКАХ:*** *гучыць слова аб міры; агонь ведаў у руках ленінскіх стыпендыятаў; вось ён, ключ ад таямніц навукі; урачысты момант; праз хвіліну агонь ведаў будзе перададзены першакурснікам; ганаровы прэзідыум; першакурсніца; а бацькі, як заўсёды, хвалююцца; папаўненне студэнцкай сям'і; хутка выступаць; гучыць «Гаудэамус»; свежы нумар «Беларускага універсітэта» — першакурснікам.* **Фота В. ГРАМОВІЧА.**

● ● ●





Партыя паставіла перад савецкім народам грандыёзную задачу — у кароткія тэрміны перавесці эканоміку на рэйкі інтэнсіфікацыі. Для дасягнення гэтай мэты патрэбна перабудаваць увесь гаспадарчы механізм. Адной з асноўных умоў, якія забяспечваюць хуткі перавод эканомікі на інтэнсіўны шлях развіцця, з'яўляецца максімальнае выкарыстанне «чалавечага фактару».

## БДУ: КУРСАМ ІНТЭНСІФІКАЦЫІ, ПАСКАРЭННЯ

# ЯКІМ БЫЦЬ ІНЖЫНЕРУ

У ЦЭНТРЫ ўсёй стваральнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы знаходзіцца клопат пра чалавека працы, яго ўсебаковае і гарманічнае развіццё, пра задавальненне ўзрастаючых матэрыяльных і духоўных патрэб. Яркім сведчаннем гэтых клопатаў з'яўляюцца рашэнні красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС, матэрыялы чэрвеньскай (1985 г.) нарады ў ЦК КПСС па праблемах паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, пераводу грамадскай вытворчасці на рэйкі інтэнсіфікацыі.

«Перавод вытворчасці на якасна новую тэхнічную аснову,— адзначаў тав. М. С. Гарбачоў,— прад'яўляе новыя патрабаванні да ведаў, кваліфікацыі кадраў. У сувязі з гэтым наспела неабходнасць сур'ёзнай перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Патрэбна наладзіць сістэму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ўсіх занятых у народнай гаспадарцы — і рабочых, і інжынераў, і спецыялістаў кіравання».

Гэтыя патрабаванні маюць прамыя адносіны і да развіцця вячэрняга і завочнага навучання ў вышэйшай школе.

Сярод прыродазнаўчых факультэтаў універсітэта на першым месцы па колькасці студэнтаў стаіць вячэрняе аддзяленне фізічнага факультэта. Тут займаецца больш за 350 чалавек, якія працуюць на розных прадпрыемствах, у НДІ, заводскіх лабараторыях, ВНУ і г.д. Нам даводзіцца сутыкацца з многімі студэнтамі, пачынаючы ад першакурснікаў і канчаючы выпускнікамі, па пытаннях паспяховасці, стараннасці і якасці іх вучобы. Пры гэтым заўсёды ўзнікае заканамернае пытанне: чым растлумачыць, што якасныя паказчыкі студэнтаў-фізікаў заўсёды ніжэйшыя, чым на іншых прыродазнаўчых факультэтах? Няўжо тут горшы кантынгент студэнтаў? Але калі пазнаёміцца з асабістымі справамі студэнтаў, паслухаць водгукі аб іх з месца работы, папрысутнічаць на абаронах курсавых і дыпломных работ, то прыходзіш да вываду: не, ніколькі не горшы. Дыпломныя работы выпускнікі-фізікі абараняюць у асноўным на «выдатна» і «добра», большасць гэтых работ дзяржаўнымі экзаменацыйнымі камісіямі рэкамендуюцца да ўкаранення, многія студэнты ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце. Тэмы дыпломных работ актуальныя і маюць практычнае выкарыстанне. І тым не менш з году ў год 30—35 працэнтаў студэнтаў здаюць экзамены толькі на «здавальняюча», многа нездавальняючых адзнак, няявак на экзамены. А на фізічны ж факультэт паступаюць, як правіла, людзі, якія любяць і разбіраюцца ў фізіцы і матэматыцы. Безумоўна, яны ведаюць, што фізфак — адзін з самых цяжкіх факультэтаў ва універсітэце, што патрэбна шмат намаганняў для добрай вучобы, што аснова поспехаў у сістэме, парушэнне якой пагражае студэнту-вячэрніку дрэннымі вынікамі.

Многія са студэнтаў пытанне вучобы, яе якасці разглядаюць як справу асабістую. Але гэта не так. Асабістым з'яўляецца толькі пытанне паступлення — можна выбраць па свайму жаданню ВНУ (хаця для вячэрніка і гэта істотнае пытанне), атрымліваць ці не атрымліваць наогул вышэйшую адукацыю. Але для паступіўшага, для студэнта пытанне якасці вучобы ўжо выходзіць за межы асабістага і набывае дзяржаўную важнасць і значнасць. Вось гэтага якраз і не ўсведамляюць многія студэнты.

Усе гэтыя праблемы абмяркоўваліся на нарадзе дэканатаў фізфака, факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна, МРТІ, кіраўніцтва ВА «Інтэграл» сумесна з работнікамі аб'яднання, якія вучацца без адрыву ад вытворчасці ва універсітэце і ў радыётэхнічным інстытуце. Прадстаўнікі аб'яднання адзначылі, што ёсць прамая сувязь паміж якасцю вучобы і работы па той прычыне, што гэта абумоўлівае прафесійны рост іх работнікаў. Патрэбна дадаць, што на ВА «Інтэграл» працуе больш за 50 студэнтаў-вячэрнікаў фізфака. Дрэнных спецыялістаў прадпрыемствам не трэба. І гэта натуральна ў цяперашніх умовах. Усё сказанае можна праілюстраваць на прыкладзе ВА «Інтэграл».

Справа ў тым, што на працягу многіх гадоў паступова складвалася такое становішча, што тыя, хто закончыў ВНУ без адрыву ад вытворчасці, у тым ліку фізфак нашага універсітэта, не аказвалі істотнага ўздзеяння на навукова-тэхнічны прагрэс аб'яднання. Працэнт такіх быў нязначны, а папаўненне інжынернымі кадрамі ішло ў асноўным за кошт прытоку маладых спецыялістаў дзённых аддзяленняў і, што істотна, у большасці іншагародніх. Гэта садзейнічала рашэнню праблем у галіне распрацоўкі новай тэхналогіі, укараненню новай тэхнікі. Зараз жа становішча карэнным чынам змянілася. Аб'яднанне не можа па многіх прычынах прымаць іншагародніх спецыялістаў. Адна з гэтых прычын у тым, што ў Мінску колькасць студэнтаў-мінчан складае толькі 50 працэнтаў, што ў значнай ступені абмяжоўвае магчымасць адбору патрэбных для прадпрыемства спецыялістаў. Вось гэта і дыктуе неабходнасць звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці. Усё сказанае ў аднолькавай ступені датычыцца ўсіх прадпрыемстваў, НДІ і ўстаноў Мінска.

Перспектыва росту, станаўлення маладога спецыяліста вызначаецца, закладваецца ў перыяд вучобы, і студэнт-завочнік у гэтым плане мае самыя спрыяльныя ўмовы. Аднак многія з іх хацелі б, каб вучэбны працэс праходзіў без асаблівых духоўных, маральных і фізічных намаганняў і напружання. Але ж і іншае зразумела: ва ўмовах абмежаванага часу вячэрніку даводзіцца ахвяраваць многім дзеля дасягнення мэты — атрымання вышэйшай адукацыі. Перад студэнтам-вячэрнікам стаіць пытанне аб тым, каб не толькі закончыць універсітэт, атрымаць дыплом, але і закончыць ВНУ на «добра» і «выдатна», стаць спецыялістам у поўным сэнсе гэтага слова. Спецыялістам, якога б паважалі, цанілі, лічыліся з ім там, дзе ён працуе.

Натуральна, у студэнтаў шмат цяжкасцей. Працаваць, вучыцца, а людзям сямейным — асабліва складана. Але галоўная прычына дрэннай вучобы — гэта, як правіла, апраўданне перад самім сабой сваіх няўдач, нізкай паспяховасці, карацей, страта патрабавальнасці да самога сябе. З гэтага пачынаюць усе тыя, каго потым адлічваюць з-за непаспяховасці.

Відавочна адно: іменна ў гады вучобы ўдасканальваюцца стыль і культура мышлення, ідзе накапленне інтэлектуальнага патэнцыялу. Лекцыі па грамадскіх і фізіка-матэматычных дысцыплінах, семінарскія і практычныя заняткі ў цесным спалучэнні з практычнай дзейнасцю фарміруюць індывідуума і як чалавека, і як спецыяліста. Вось на такіх студэнтаў-вячэрнікаў, будучых спецыялістаў, і разлічваюць ВА «Інтэграл», іншыя прадпрыемствы, НДІ.

На ВА «Інтэграл» у гэтым напрамку ўжо прыняты шэраг канкрэтных мер, накіраваных на павышэнне адказнасці студэнтаў за вучобу. Напрыклад, розным катэгорыям наладчыкаў, кантралёраў, выпрабавальнікам і прадстаўнікам іншых спецыяльнасцей пяты разрад будзе прысвойвацца толькі тады, калі яны будуць мець адпаведную адукацыю або вучацца (прытым паспяхова!) без адрыву ад вытворчасці ў ВНУ. Такім чынам, на прадпрыемствах глядзяць на студэнтаў-вячэрнікаў як на патэнцыяльных інжынераў, у будучым спецыялістаў высокай кваліфікацыі, якіх пасля заканчэння вучобы можна назначыць не на другарадныя пасады, а даручыць сур'ёзную работу па распрацоўцы і ўкараненню новай тэхнікі і тэхналогіі. У гэтым плане вучоба без адрыву ад вытворчасці з'яўляецца эфектыўнай крыніцай падрыхтоўкі.

**Л. ДАВЫДЗЕНКА,**
**прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню, дацэнт.**

**І. ЛІПНІЦКІ,**
**намеснік дэкана па вячэрняму аддзяленню, дацэнт.**

## ПРАКТЫКА



ДЛЯ МНОГІХ студэнтаў філалагічнага факультэта лета — пара захапляючай і складанай даследчай работы на дыялекталагічнай практыцы. Паездкі ў самыя аддаленыя куткі нашай рэспублікі, сустрэчы з людзьмі, збор і апрацоўка матэрыялу — гэта не толькі магчымасць праверыць свае веды і навыкі, атрыманыя на працягу навучальнага года, але і ўменне правільна весці гутарку, правільна транскрыбіраваць, словам, адчуць сябе ў ролі навуковага работніка-дыялектолага.

Студэнты 2-га курса аддзялення рускай мовы і літаратуры пабывалі ў гэтым годзе на Жлобіншчыне, дзе збіралі матэрыял для слоўніка рускіх гаворак Беларусі. Кожнаму практыканту патрэбна было высветліць значэнне, этымалогію, стылістычную афарбоўку, падабраць прыклады ўжывання некалькіх сотняў слоў.

Сустрэчы са старажыламі абагацілі выхаванцаў БДУ веданнем гісторыі краю, асаблівасцей быту і культуры вёсак, дзе яны пабывалі.

**НА ЗДЫМКАХ: аспірантка кафедры рускай мовы Алена Лісоўская (справа) кансультуе студэнтку Галіну Дрык;**

**Інга Бутрым і Кацярына Бальшакова за зборам матэрыялу.**

**Тэкст і фота**
**Г. ЮРЧАНКІ,**
**загадчыка лінгафоннай лабараторыяй філалагічнага факультэта.**



## А ТЫ ПАДПІСАЎСЯ?

# ВЕСНІК

*Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна*

ПРАЦЯГВАЕЦЦА падпіска на навукова-тэарэтычны часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна». Выходзіць ён у чатырох серыях, на кожную з якіх можна падпісацца асобна.

Першая серыя ўключае арыгінальныя артыкулы па пытаннях матэматыкі, фізікі і механікі.

Для біёлагаў, хімікаў і географаў, безумоўна, уяўляе вялікую цікавасць серыя, якая асвятляе распрацоўкі тэм гэтых напрамкаў навукі і практыкі.

Для тых, хто цікавіцца актуальнымі праблемамі грамадскіх навук, прызначаецца трэцяя серыя. У ёй пяць асноўных раздзелаў: гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, права.

Чацвёртая серыя — адзінае ў Беларусі перыядычнае выданне па пытаннях літаратуразнаўства, мовазнаўства, журналістыкі, педагогікі і псіхалогіі. Часопіс сістэматычна знаёміць чытачоў з важнейшымі навуковымі дасягненнямі беларускіх літаратуразнаўцаў, крытыкаў, лінгвістаў, журналістаў і псіхолагаў.

Кожная серыя выходзіць тры разы ў год.

Як набыць часопіс старэйшай ВНУ рэспублікі? Па падпісцы. Яна прымаецца без абмежаванняў усімі аддзяленнямі сувязі і грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

Часопіс у рознічны продаж не паступае.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

5 верасня 1985 г.
Зак. 2875. АТ 13677.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.